фесійны псіхалагічны адбор і псіхалагічнае суправаджэнне студэнтаў. Гэта дазволіць вырашыць задачу падрыхтоўкі ў ВНУ прафесійна годных і здольных канкурыраваць на рынку працы спецыялістаў. Аднак рашэнне гэтай задачы патрабуе ўвядзення ў ВНУ спецыяльнай псіхалагічнай службы.

Жмуроўская Л.Д.,
выкладчык

## ДА ПЫТАННЯ ІНТЭНСІЎНЫХ МЕТАДАЎ ВЫКЛАДАННЯ

Пашырэнне міжнародных кантактаў, з аднаго боку, і рост аўдыёвізуальнай інфармацыі, з другога, выклікаюць неабходнасць канцэптуальна новага падыходу да вывучэння замежных моў. Па гэтай канцэпцыі працэс авалодання мовай адпарадкоўваецца законам моўнай камунікацыі ў вуснай альбо пісьмовай форме. У цяперашні час гэта найбольш перспектыўны напрамак у методыцы выкладання замежных моў, таму што ён адпавядае патрэбнасцям грамадства ў сучасны момант і асабістым установкам студэнтаў.

Вядзенне заняткаў па інтэнсіўнай методыцы прадугледжвае шырокае выкарыстанне тэхнічных, аўдыёвізуальных сродкаў навучання: тэлевізара, магнітафона, відэамагнітафона, радыё, камп'ютэра і прайгравальніка. Яны з'яўляюцца лепшымі сродкамі вывучэння замежнай мовы, таму што дазваляюць рабіць заняткі жывымі і захапляючымі і ўлічваць псіхалагічныя і індывідуальныя асаблівасці навучэнцаў. Самыя вялікія патэнцыяльныя магчымасці закладзены ў тэлебачанні. Ні адзін выкладчык, як лічыць Р.Вандэрпланк, не можа даць навучэнцам такога мноства сапраўдных сітуацый, сюжэтаў, характараў і праблем, як тэлевізійная праграма. Утрымліваючы ўвагу і інтарэс навучэнцаў пра дапамозе тэатральных эфектаў і гумару, выкладчык раскрывае перад студэнтамі лексічнае багацце і структурныя магчымасці замежнай мовы. Моцнае зрокавае ўражанне ў першую чаргу садзейнічае запамінанню гутарковых узораў з патрэбнай інтанацыяй.

Радыё ў параўнанні з тэлевізарам больш гібкі сродак навучання замежнай мове, таму што пры дапамозе гукавога эфекта магчыма пагрузіць студэнта ў атмасферу мовы любой краіны. І радыё, і тэлебачанне даюць магчымасць уяўляць аўтэнтычную, жывую гутарку і паказваюць багацце яе гучання ў адрозненне ад штучнай фразеалогіі падручніка альбо метадычнага дапаможніка. Аднак выкарыстанне радыё і тэлебачання абмежавана недаўгавечнасцю праграмы. У гэтым выпадку надзвычай неабходным аказваецца выкарыстанне аўдыё- і відэакасет. Яны дапамагаюць выкладчыку ажыццявіць кантроль над уменнямі і навыкамі вуснай мовы студэнтаў. Найбольш паспяховым вучэбным курсам з'яўляецца серыя тэлевізійных і радыёперадач «Follow me», распрацаваная Бі-бі-сі. Гэты курс складаецца з 60 тэлевізійных урокаў і 61 дадатковага радыёўрока. Да іх дадаюцца самавучыцелі на двух мовах, а таксама аднамоўныя падручнікі і зборнікі практыкаванняў. У курсе арганічна спалучаюцца ўсе сродкі: тэлебачанне, радыё, кніга для чытання і практыкаванні ў пісьме, відэа-і магнітафонныя касеты, мэта якіх -- развіццё і замацаванне навыкаў замежнай мовы.

Шырокія магчымасці аўдыёвізуальных сродкаў дазваляюць уцягнуць студэнтаў у розныя ролевыя сітуацыі і гульні. Гэта могуць быць простыя сітуацыі па абмену рэплікамі ў краме, бібліятэцы, на канцэрце, запіс на слых адраса, тэлефона, месца сустрэчы. Больш складаныя – гэта абмен думкамі, уражаннямі, абмеркаванне планаў сумеснай дзейнасці, запаўненне розных анкет, напісанне аб'яў. Найбольш складаныя ролевыя сітуацыі -- інтэрвʼю з вядомымі дырыжорамі або рэжысёрамі, абмеркаванне вынікаў фестывалю народ-най музыкі, канферэнцыя ў бібліятэцы, рэпетыцыя тэатральнай трупы, напісанне дзелавога пісьма, аната-цый прачытанага, дыскусіі на прафесійныя тэмы.

У працэсе ролевых гульняў студэнты вучацца не толькі выказваць свае думкі на замежнай мове, але ава-лодваць тактыкай і стратэгіяй дыялагічных зносін, ву-чацца быць суразмоўцамі.

Авалоданне формамі зносін асабліва важна ў навучэнні студэнтаў універсітэта культуры, таму што дадзеныя ўменні ляжаць у аснове прафесійнай дзейнасці будучых мэнеджэраў, сацыяльных педагогаў, кіраўнікоў масавых відовішчаў і бібліятэкараў.

Абагульняючы вышэйвыкладзенае, трэба адзначыць, што інтэнсіўныя метады выкладання:

1) абапіраюцца на вялікія магчымасці тэхнічных, аўдыёвізуальных сродкаў, дзякуючы якім дасягаюцца нагляднасць, вобразнасць і эмацыянальнасць навучання;

2) улічваюць псіхалагічныя і індывідуальныя асаблівасці студэнтаў;

3) разглядаюць ролевыя гульні і сітуацыі як важнейшы кампанент навучальнай дзейнасці, у працэсе якой эфектыўна фарміруюцца моўныя і прафесійныя уменні і навыкі студэнтаў.

Бубенка І.В.,
аспірантка
Каганаў А.Б.,
дацэнт

## ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ Ў СТУДЭНТАЎ

У сучасных умовах пераходу Рэспублікі Беларусь да рынкавай эканомікі, адраджэння нацыянальнай культуры, самабытнасці, узрастання нацыяналь-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ